ТОЛЬКІ ТАК!

СПРАВАВОДСТВА па-БЕЛАРУСКУ!

Красавік, 2015

У НУМАРЫ:

Правы спажыўцоў – кожнаму!

Змены ў закон “Аб абароне правоў спажыўцоў”

- Пазіцыя дэпутата Лапацінай

- Пазіцыя дэпутата Цацоха





НАЦЫЯНАЛЬНЫ СХОД РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
ДЭПУТАТ
ПАЛАТЫ ПРАДСТАЎНІКОЎ
вул. Савецкая, 11, 220010, г. Мінск

НАЦИОНАЛЬНОЕ СОБРАНИЕ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ
ДЕПУТАТ
ПАЛАТЫ ПРЕДСТАВИТЕЛЕЙ
ул. Советская, 11, 220010, г. Минск

26.03.2015 № 15

Случаку І. У.

Паважаны Ігар Уладзіміравіч!

Дзякую за чарговую прапанову аб выкарыстанні беларускай мовы і звяртаю Вашу ўвагу на тое, што пункт 9 артыкула 7 Закона Рэспублікі Беларусь ад 9 студзеня 2002 г. № 90-З “Аб абароне правоў спажыўцоў”, вызначае, што інфармацыю аб таварах вытворца абавязаны давесці да ведама спажыўца на беларускай або на рускай мове.

Лічу, што канстытуцыйная норма ў гэтым сэнсе рэалізуецца ў поўнай меры.

З павагай, дэпутат А.Л.Лапаціна

НАЦЫЯНАЛЬНЫ СХОД
РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
ДЭПУТАТ
ПАЛАТЫ ПРАДСТАЎНІКОЎ

НАЦИОНАЛЬНОЕ СОБРАНИЕ
РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ
ДЕПУТАТ
ПАЛАТЫ ПРЕДСТАВИТЕЛЕЙ

13.04.2015 № 31

на № ______

Случаку І.У.

Паважаны Ігар Уладзіміравіч!

Мною разгледжаны Ваш зварот па пытанні аб унясенні змяненняў у Закон Рэспублікі Беларусь ад 9 студзеня 2002 г. № 90-З “Аб абароне правоў спажыўцоў”. Ваша прапанова патрабуе ўсебаковай прапрацоўкі і шырокага вывучэння як сярод спажыўцоў, так і сярод вытворцаў.

Трэба адзначыць, што пункт 9 артыкула 7 “Інфармацыя аб таварах (работах, паслугах)” і пункт 4 артыкула 8 “Інфармацыя аб вытворцах (выканальніках, прадаўцах)” вызначае, што інфармацыя абавязана быць даведзена да ведама спажыўца на беларускай або на рускай мове, што адпавядае артыкулу 17 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь. На мой погляд, інфармацыя на дзвух мовах у абавязковым парадку выклікае павелічэнне фінансавых затрат, а любое павышэнне кошту тавара можа выклікаць незадавальненне многіх катэгорый грамадзян. Таму лічу, што Ваша прапанова немэтазгодна.

Дэпутат А.У. Цацоха

Я МАГУ ДАПАМАГЧЫ?

ТАК!

У ЧЫМ РОЗЬНІЦА ПАМІЖ МЫЛАМ ДЛЯ РУК І МЫЛАМ ДЛЯ ЦЕЛА?

НУ,

АДНО ДЛЯ РУК, А ДРУГОЕ — ДЛЯ ВАШАГА ЦЕЛА.

k009

M&S MEDIA

Уладальнікі выдання ***M&S Media***

Заснавальнік: *Францыск Піцерскі*
Галоўны рэдактар: *Алесь Пыхаў*
Карэктар: *Мікола Хмызняк*

246050, г. Гомель, вул. Пуліхава, 17,
рэдакцыя "Справаводства па-Беларуску"

Надрукавана на
Папяровай фабрыцы "ГумНо", г. Клінцы,
вул. Мажаеўская, 17б.

Тыраж: 250 асобнікаў.

Распаўсюджваецца безкаштоўна.



Архіў газеты "Справаводства па-беларуску!" ў Беларускай інтэрнэт-бібліятэцы KAMUNIKAT:
http://kamunikat.org/spravavodstva_pa_bielarusku.html
Архіў УКантакце: http://vk.com/docs?oid=-19441275
Мы ў сацыяльных сетках:
vk.com: spravavodstva_pa_belarusku
facebook.com: spravavodstva

M&S MEDIA